*9.* Інтэрв'ю аўтара з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, дацэнтам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны БДУКМ А. А. Трусавым 24.06.2022.

*10. Смолік, А. І.* Граф Канстанцін Тышкевіч: вучоны, археолаг, краязнаўца: культурна-асветніцкая дзейнасць старажытнага беларускага роду / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 8. – С. 82–86.

*11. Смолік, А. І.* Тышкевіцкія чытанні / А. І. Смолік // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2009. – № 2 (12). – С. 111–114.

*12. Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс ; пер. с фр. и вступ. статья С. Н. Зенкина. – М. : Новое издательство, 2007. – 248 с. – (А).

УДК [069.8+82.091]:361.7Тышкевічы

**А. А. Трусаў,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БРАТОЎ ТЫШКЕВІЧАЎ У ПАДРУЧНІКАХ І ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У артыкуле аналізуецца вяртанне гістарычнай спадчыны братоў Тышкевічаў у гістарычныя энцыклапедыі, падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы па гісторыі Беларусі, культуралогіі, музеязнаўстве і ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

**Ключавыя словы:** музей, гісторыя, культуралогія, археалогія, этнаграфія, музеязнаўства, браты Тышкевічы.

**A. A. Trusau,**
*Candidate of Historical Studies, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Historical and*
*Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State*
*University of Culture and Arts", Minsk*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# THE REFLECTION OF THE ACTIVITIES OF THE TYSZKIEWICZ BROTHERS IN TEXTBOOKS AND TUTORIALS ON THE HISTORY OF BELARUS

The article analyzes the return of the historical heritage of the Tyszkiewicz brothers to historical encyclopedias, textbooks, educational and methodological complexes on the history of Belarus, cultural studies, museum studies and the protection of historical and cultural heritage.

**Key words:** museum, history, cultural studies, archeology, ethnography, museum studies, Tyszkiewicz brothers.

Вывучаць гісторыю Беларусі як асобны прадмет пачалі ў БССР, бо да гэтага ў 1910 г. у Вільні выйшла асобным выданнем кніга Вацлава Ластоўскага «Кароткая гісторыя Беларусі», якая раней друкавалася ў газеце «Наша ніва» [12].

Першым школьным падручнікам па гісторыі Беларусі быў «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» Усевалада Ігнатоўскага, які некалькі разоў перавыдаваўся (апошні раз у 1926 г.).

Пра XIX ст., калі жылі і дзейнічалі браты Тышкевічы, Ігнатоўскі піша няшмат. Першая дата ў яго падручніку (1807 г.) – стварэнне Віленскай вучэбнай акругі і заснаванне ў Вільні ўніверсітэта. Потым ідзе вайна 1812 г., паўстанне 1830–1831 гг., сялянская рэформа 1861 г., паўстанне 1863 г., «Мяжа аселасці 1882 г.» і стварэнне ў 1898 г. у Менску пры дапамозе Бунду РСДРП. Вядома, пра дзейнасць братоў Тышкевічаў і стварэнне імі першых музеяў у Лагойску і Вільні тут нічога няма. Пасля таго, як у 1930 г. Ігнатоўскі быў рэпрэсіраваны і застрэліўся, яго кнігі і падручнікі былі забароненыя.

Пасля Другой сусветнай вайны ў нашых школах шмат гадоў гісторыю Беларусі выкладалі па падручніках пад рэдакцыяй Лаўрэнція Абэцэдарскага. Возьмем да прыкладу рускамоўны падручнік для сярэдняй школы 1976 г. [1]. У параграфе 17 «Беларуская культура ў першай палове XIX ст.» ёсць невялікія раздзелы:

а) Умовы развіцця беларускай культуры;

б) Народная творчасць;

в) Літаратура (с. 79–81).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пра дзейнасць Тышкевічаў няма ніякіх згадак.

Паглядзім таксама падручнік па гісторыі Беларусі для ВНУ [11]. «Глава 7. Разложение крепостного строя и формирование капиталистических отношений в первой половине XIX в.» (Глядзім 6 параграф «Культура»).

Адзначым, што ўсе ВНУ ў БССР працавалі выключна на рускай мове і гісторыя Беларусі не была выключэннем. Тут на некалькіх старонках (с. 192–195) можна знайсці імёны і прозвішчы некаторых пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў.

Аўтары падручніка, кажучы пра развіццё навукі, сцвярджаюць, што «в среде интеллигенции усиливался интерес к белорусской этнографии, фольклору, литературе», аднак на іх думку «Развитие белорусской культуры, несмотря на тормозящее воздействие крепостничества и реакционной политики царизма, происходило под благотворным воздействием передовой русской культуры, во взаимовлиянии с культурой русского, украинского, польского и литовского народов». Цікава, да якога з пералічаных вышэй народаў аўтары падручніка маглі аднесці братоў Тышкевічаў?

Першым беларускім навукоўцам, які вярнуў нам навуковую спадчыну братоў Тышкевічаў быў Генадзь Каханоўскі [14]. У сваёй манаграфіі ён дае навуковую біяграфію спачатку малодшага брата Яўстаха Тышкевіча (1814–1873), а потым і старэйшага Канстанціна (1806–1863).

Я. Тышкевіч, на думку Каханоўскага, гэта – археолаг, фальклярыст і краязнавец, а К. Тышкевіч – археолаг, гісторык, этнограф, краязнавец, стваральнік музеяў у Лагойску і Вільні.

Г. Каханоўскі дае аналіз асноўных публікацый братоў Тышкевічаў. Ён дае высокую адзнаку рабоце Я. Тышкевіча «Аб старажытных магілах у Мінскай губерні і Літве», расказвае пра навуковыя вандроўкі яго за мяжу, наведванне Капенгагенскага музея старажытнасцей, выкарыстанне ў Беларусі методыкі дацкага археолага К. Томсена, дэтальнае краязнаўчае вывучэнне ім Барысаўскага павета і напісанне ім працы «Апісанне Барысаўскага павета».

Даючы аналіз навуковай дзейнасці Канстанціна Тышкевіча, Г. Каханоўскі спыняецца на яго манаграфіі «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі». Акрамя курганоў, К. Тышкевіч быў першым, хто ў Беларусі стаў вывучаць старажытныя гарады

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лагойск і Заслаўе. Ён таксама складае тапаграфічныя планы беларускіх замкаў і гарадзішчаў. Г. Каханоўскі адзначае навуковую вартасць кнігі К. Тышкевіча «Вілія і яе берагі».

Пасля атрымання незалежнасці вывучэнне гісторыі Беларусі стала абавязковым прадметам як у школах, так і ў ВНУ. У 1992 г. у серыі «Нашы славутыя землякі» выходзіць праца Генадзя і Аляксандра Каханоўскіх (бацькі і сына) «Руплівец нашай Старасветчыны», прысвечаная жыццю і дзейнасці Яўстаха Тышкевіча [14].

Аўтары кнігі спрабуюць вызначыць этнічную прыналежнасць Тышкевічаў і так пішуць пра гэта: «Як часта тады бывала ў беларускіх сем'ях, называючы сябе «ліцьвінамі», браты Тышкевічы разумелі пад гэтым сваю прыналежнасць да цэнтральнай і заходняй частак Беларусі, якая фігуравала ў іх як «Літва», або «Руская Літва», і толькі Магілёўшчыну і ўсходнюю Віцебшчыну ды большую частку Смаленшчыны яны называлі Беларуссю, а жыхароў – беларусамі (с. 28).

Кніга Каханоўскіх мае шмат цікавых ілюстрацый. Сярод іх – алоўкавы малюнак мастака Ю. Герасімёнка-Жызнеўскага, адшуканы ў Дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільні, з выявай Яўстаха Тышкевіча. Таксама прыводзяцца археалагічныя знаходкі з курганоў Цэнтральнай Беларусі з калекцыі Тышкевічаў і матэрыялы археалагічных знаходак Яўстаха Тышкевіча.

У 1994 г. з'яўляецца грунтоўнае акадэмічнае выданне «Нарысы гісторыі Беларусі» [16], дзе ў раздзеле «Беларусазнаўства» ёсць ужо згадка пра «стварэнне па ініцыятыве Я.Тышкевіча Віленскага музея старажытнасцей і Віленскай археалагічнай камісіі» (с. 298). Тут жа ідзе гаворка аб тым, што «цяжка перабольшыць уклад, які ўнеслі ў стаўленне беларускай археалогіі, этнаграфіі, краязнаўства браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы…» (с. 299).

У тым жа 1994 г. нарэшце пабачыла святло кніга М. В. Доўнара-Запольскага «Гісторыя Беларусі», напісаная ім на рускай мове і адразу забароненая ў 1926 г., па прапанове В. Сербента. Кнігу пераклалі на беларускую мову і выдалі Беларуская Энцыклапедыя і Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь [20]. М. В. Доўнар-Запольскі сярод вядомых этнографаў Беларусі XIX ст. не забыў прыгадаць графа Яўстафія Тышкевіча і яго кнігу «Апісанне Барысаўскага павета» (1848) (с. 352).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У 1996 г. выйшла манаграфія маскоўскага археолага Леаніда Аляксеева «Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в.», у якой ён адзін з раздзелаў сваёй кнігі так і назваў «Братья Тышкевичи» [2].

Даючы аналіз дзейнасці Канстанціна Тышкевіча, Аляксееў адзначае, што той не толькі шмат увагі звяртаў на методыку раскопак курганоў, але быў першым археолагам, які стаў аналізаваць ганчарныя клеймы на донцах курганных гаршкоў і стараўся растлумачыць іх паходжанне і сімволіку.

Яшчэ далей у вывучэнні курганоў пайшоў яго малодшы брат Яўстафій. (У сучаснай літаратуры малодшага з братоў Тышкевічаў называюць Яўстафій або Яўстах.) Аляксееў лічыў, што менавіта ён заклаў асновы беларускай навуковай археалогіі (с. 61). Аднак ён піша, што дакладна невядома, хто быў першы з братоў Тышкевічаў, які пачаў капаць курганы і дае спасылку на Кіркора, які называе дату 1837 г., калі Яўстах Тышкевіч раскапаў першы ў сваім жыцці курган (с. 65). Галоўнай заслугай Яўстаха перад навукай Аляксееў лічыў стварэнне Віленскага музея старажытнасцей і пры ім Археалагічнай камісіі (1855–1865). Л. Аляксееў напісаў спецыяльны раздзел у сваёй манаграфіі «Разгром Виленского музея и Археологической комиссии» (1865), у якім падрабязна расказаў пра роль М. Мураўёва ў знішчэнні гэтых навуковых асяродкаў. Дзякуючы яму музей «был объявлен средоточием полонизма» (с. 81).

Л. Аляксееў таксама амаль цалкам перадрукаваў тэкст праекта зборніка навуковых артыкулаў на аснове калекцый музея, напісаны Я. Тышкевічам у 1864 г. і пазней надрукаваны без яго згоды новымі кіраўнікамі музея ў 1868 г. у газеце «Виленский вестник» (с. 82–83).

Інфармацыя пра жыццё і дзейнасць братоў Тышкевічаў пачала трапляць і на старонкі энцыклапедычных выданняў. Так, у 1993 г. у адным з іх Г. Кахаоўскі змясціў змястоўныя артыкулы з партрэтамі Тышкевічаў [3] (с. 622–623).

У 1996 г. гістарычны факультэт БДУ і навукова-даследчая лабараторыя гісторыі Беларусі выдалі навуковы дапаможнік для ВНУ, каледжаў, ліцэяў, гімназій і школ краіны па гісторыі Беларусі з мэтай абагуліць неабходную інфармацыю па айчыннай гісторыі, каб даць магчымасць абітурыентам, школьнікам і студэнтам усвядоміць логіку і фактычную канкрэтыку развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага працэсу. Дапаможнік ахоплівае усе пытанні, якія выносіліся на экзамен па гісторыі Беларусі [5].

У экзаменацыйным пытанні «Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.», сярод дат, што трэба ведаць, уводзілася дата 11 мая 1855 г. – заснаванне Я. П. Тышкевічам у Вільні музея старажытнасці (с. 136). Да гэтага пытання даваліся кароткія біяграфіі К. П. Тышкевіча і Я. П. Тышкевіча (с. 137–138). Далей ішла асобна інфармацыя пра Віленскі музей старажытнасцей і Віленскую археалагічную камісію (с. 140).

Пазней інфармацыя пра братоў Тышкевічаў стала з'яўляцца ў розных дапаможных матэрыялах для школьнікаў па гісторыі Беларусі [17; 22] і ў саміх школьных падручніках [6].

У 2004 г. выходзіць вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў БДУ гістарычнага факультэта БДУ «Гісторыя Беларусі XIX ст.» [21].

Там адзначаецца, што «шырокую вядомасць у першай палове XIX ст. атрымалі ў тым ліку і праца братоў Тышкевічаў, стваральнікаў беларускай археалогіі і музеязнаўства» (с. 82). Таксама ў тэкстах для праверкі ведаў студэнтаў ёсць такое пытанне: «калі быў заснаваны музей старажытнасцей у Вільні»? (с. 121). Таксама ў раздзеле «Храналогія» ёсць дата 1842 г. – заснаванне ў Лагойску першага ў Беларусі гісторыка-археалагічнага музея (с. 237).

Дзейнасць братоў Тышкевічаў сталі вывучаць студэнты і іншых спецыяльнасцей. Так, у 2012 г. выйшаў вучэбны дапаможнік, напісаны А. Гужалоўскім для студэнтаў ВНУ, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) [9].

У кнізе даецца падрабязнае апісанне Лагойскага музея і археалагічнай калекцыі, сабранай у выніку раскопак курганоў К. Тышкевічам у Барысаўскім і Мінскім паветах.

Гужалоўскі адзначае вялікі ўклад К. Тышкевіча ў развіццё музейнай справы Беларусі, бо ён упершыню паставіў на трывалы навуковы грунт прыватнае збіральніцтва (с. 23).

У раздзеле «Музеі навуковых таварыстваў» ён апавядае пра стварэнне Яўстахам Тышкевічам Віленскага музея старажытнасцей і яго лёс. У музеі прадметы былі сістэматызаваны паводле калекцыйнага прынцыпу, што адпавядала дасягненням тагачаснай экспазіцыйнай практыкі. Папулярнасць музея хутка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

расла, бо ўсяго толькі за 1856 г. яго наведала 7150 жыхароў Вільні і прыезджых (с. 69).

У 2014 г. А. І. Смолік, Л. К. Кухто надрукавалі вучэбна-метадычны комплекс «Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі» для студэнтаў ВНУ па спецыяльнасці 1-24-04 01 Культуралогія [19]. Даследчыкі адзначаюць, што «выспяванне нацыянальнай свядомасці пабудзіла прадстаўнікоў розных грамадска-палітычных кірункаў да ўсебаковага вывучэння эканомікі, гісторыі, мовы, культуры Беларусі і асобных яе рэгіёнаў». У сувязі з гэтым яны адзначаюць шматграннасць і фундаментальнасць працы братоў Тышкевічаў, заснавальнікаў айчыннай навуковай археалогіі, музеязнаўства, фалькларыстыкі і этнаграфіі (с. 79). Пры гэтым даследчыкі сцвярджаюць, што з вывучэння лагойскіх старажытнасцей браты Тышкевічы і пачалі сваю навукова-археалагічную і краязнаўчую дзейнасць. Падчас вывучэння пахавальнага абраду крывіцкіх курганоў, яны першымі адзначылі этнічныя прыкметы – скроневыя кольца ў жанчын, тым самым далі ключ для вызначэння тэрыторыі крывічоў. Таксама складальнікі ВМК па культуралогіі раскрываюць ролю Тышкевічаў як фалькларыстаў. Яны прыходзяць да высновы, што Я. Тышкевіч, збіраючы разам з братам песні, легенды, прыказкі і прымаўкі, быў першым з беларускіх этнографаў, які апісваў памінальныя калядныя абрады беларусаў (с. 80). Усю вышэйзгаданую інфармацыю даследчыкі змясцілі ў раздзеле «Станаўленне айчыннай этнакультуралогіі».

Не забывалі пра братоў Тышкевічаў і прафесійныя беларускія гісторыкі. У 2013 г. доктар гістарычных навук, прафесар Валянцін Голубеў выдаў інфармацыйна-метадычны дапаможнік «Гісторыя Беларусі – даты, падзеі, асобы», у якім пад 1842 г. адзначаецца «заснаванне Канстанцінам Тышкевічам у Лагойску першага ў Беларусі гістарычнага музея» [9, с. 79]. У 2015 г. Валянцін Голубеў і Ірына Кітурка надрукавалі навукова-папулярны зборнік «Гісторыя Беларусі ад пачатку XIX ст. да 1945 года» [4]. У параграфе «Культурнае развіццё. Змены ў сістэме адукацыі. Навука» аўтары адзначаюць вялікі ўнёсак братоў Тышкевічаў у вывучэнне беларускай гісторыі і культуры. Пры гэтым яны лічаць, што «ўздым цікавасці да гістарычнага мінулага беларускага народа сведчыў пра новы ўздым развіцця беларускага этнасу. Дзеячы навукі і культуры не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі вывучалі мінулае, але, выкарыстоўваючы нацыянальную памяць і гістарычныя традыцыі, займаліся адукацыяй і асветай народа» (с. 31).

Аднак найбольшую інфармацыю пра ролю братоў Тышкевічаў у станаўленні беларускай гістарычнай навукі прывяла доктар гістарычных навук, прафесар Марыя Бяспалая ў сваім ВМК «Гісторыя Беларусі XIX – пачатак XX ст.», які надрукаваны ў 2018 г. [4]. Даследчыца падрабязна распавядае пра стварэнне Віленскага музея старажытнасцей і пры гэтым адзначае, што «вакол ідэі стварэння музея старажытнасцей сфарміравалася дастаткова шырокае кола заможных асоб, зацікаўленых у гэтай справе. З аднаго боку, яны разглядалі музей як цэнтр захавання артэфактаў гісторыі і культуры роднага краю, з іншага – разумелі найважнейшае значэнне іх прэзентацыі сярод шырокіх колаў насельніцтва. Музей – гэта была рэальная справа. Мэты і формы яго дзейнасці былі зразумелыя ўсім і адпавядалі агульнаеўрапейскай тэндэнцыі стварэння нацыянальных музеяў, як, напрыклад, у Будапешце і Празе».

Нельга не пагадзіцца і з такой думкай Марыі Бяспалай: «Па трапным выразе аднаго з французскіх гісторыкаў, нацыю стварае добры падручнік гісторыі. Але ў першай палове XIX ст. да з’яўлення першых нарысаў па гісторыі Беларусі (у пачатку XX ст.) было яшчэ далёка. У палякаў немагчымасць стварыць такія падручнікі садзейнічала развіццю гістарычнай прозы. Знакавай з’явай гэтага жанру стала творчасць Генрыка Сенкевіча. Яго героямі захапляліся не толькі палякі, але і ліцвінская шляхта, і не адно пакаленне патрыётаў Рэчы Паспалітай было ўзгадавана на ідэях і геранічных подзвігах у імя Радзімы, якія здзяйснялі героі твораў Г. Сянкевіча».

«Першая палова XIX ст. для большасці еўрапейскіх народаў, асабліва славянскіх, стала перыядам фарміравання нацый і абуджэння нацыянальнай свядомасці. На змену прынцыпу легітымізму, што азначала непарушанасць праў манархічных дынастый, прыйшла ідэя стварэння нацыянальных дзяржаў, у якіх пражывалі людзі, размаўляючыя на адной мове і маючыя агульнае гістарычнае і культурнае мінулае. Гэты працэс не вельмі выразна і хутка, але зараджаўся і ў беларускіх губернях» (с. 59–60).

Вядома, што для стварэння нацыі патрэбны не толькі падручнік па нацыянальнай гісторыі, але і свой нацыянальны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музей. Гэта добра ведалі і браты Тышкевічы і таму стварылі музей не Рэчы Паспалітай, у чым іх абвінавацію Мураўёў, а менавіта музей ВКЛ, практычна першы беларускі музей у нашай старадаўняй сталіцы Вільні.

Але чаму Яўстаху Тышкевічу пасля доўгіх спроб стварыць такі музей, які не ўхваліў імператар Мікалай І, такая спроба нарэшце ўдалася і музей вельмі паспяхова дзейнічаў амаль 10 гадоў?

Адказ на гэта пытанне нашы гісторыкі пакуль не даюць. Гартаючы шматлікія напісаныя імі падручнікі мы не знайшлі ніводнай згадкі пра прайграную Расійскай імперыяй Крымскую вайну і яе ролю для беларускай гісторыі.

Адкрыем адзін з самых папулярных падручнікаў для школ Расійскай імперыі, напісаны акадэмікам С. Ф. Платонавым і надрукаваным упершыню ў 1909–1910 гг. [19].

Там паведамляецца, што пасля прыходу да ўлады імператара Аляксандра II, падчас Крымскай вайны ў 1855 г. «тяжелый режим наместника Польши, “князя Варшавского” Паскевича, был тогда смягчен. Польским эмигрантам было разрешено вернуться в Царство (Польскае. – *А. Т.*), дана амнистия сосланным за мятеж в Сибирь полякам». «Руководствуясь советами польского патриота, маркиза Великопольского, государь решился дать Царству Польскому самоуправление (1861). Был учрежден государственный совет для Царства из поляков, для местного самоуправления устроены по губерниям советы из выборных от населения» (с. 380).

У падручніку па гісторыі Польшчы, які выйшаў у Варшаве ў 2005 г., ёсць раздзел «Польскія землі пад уладай Расіі. “Севастопальская адліга” (1853–1861)» [15]. Тут мы можам прачытаць наступнае: «Паражэнне Расіі ў Крымскай вайне 1853–1856 гг. і ўступленне Аляксандра II на расійскі прастол у 1855 г. прычыніліся да пэўнага змякчэння расійскай палітыкі ў дачыненні да Каралеўства Польскага. Падчас так званай «севастопальскай адлігі ў эканамічным і культурным жыцці Каралеўства наступіла прыкметнае ажыўленне».

«Ліквідацыя мытнай мяжы з Расіяй у 1851 г. і ўдалая эканамічная кан’юнктура паспрыялі развіццю прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, а таксама росту і развіццю гарадоў – асабліва Варшавы» (с. 144).

Згадваюць пра «севастопальскую адлігу» і літоўскія гісторыкі. Яны пішуць: «Параза Расіі ў Крымскай вайне (1853–1856)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падштурхнула новага цара Аляксандра II рыхтавацца да скасавання прыгону, змякчалася нацыянальная палітыка» [7, с. 107].

Такім чынам, і для беларускай інтэлігенцыі, што лічыла сябе «літвінамі» і актыўна карысталася ў тым ліку і польскай мовай, дзякуючы паразе Расіі ў Крымскай вайне і палітыцы новага імператара Аляксандра II, з’явілася «вакно магчымасцей». І вопытны палітык Яўстах Тышкевіч адразу гэтым скарыстаўся і бліскуча рэалізаваў тое, аб чым марыў і чаму спрыяў доўгія гады.

Віленскі музей старажытнасцей стаў адной з першых цаглін у падмурку станаўлення беларускай нацыі ў XIX – пачатку XX ст.


*1. Абецедарский, Л. С.* История БССР : учебник для средней школы / Л. С. Абецедарский, М. П. Баранава, Н. Г. Павлова. – Минск : Нар. асвета, 1976.

*2. Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е гг. XX в. / Л. В. Алексеев; под ред. Б. А. Рыбакова. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

*3.* Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с. : іл.

*4. Бяспалая, М. А.* Гісторыя Беларусі XIX – пачатак XXI ст.: ВМК / М. А. Бяспалая. – Мінск : БДУКМ, 2018. – С. 55–56.

*5.* Гісторыя Беларусі : навуч. дапам. – Мінск : Фінансы, улік, аўдыт, 1996.

*6.* Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1999 г. : вучэб. дапам. для 11 кл. агульнаадук. шк. з беларус. і рус. мовамі навучання / У. Л. Кагалаў, Г. С. Марцуль, А. Я. Новік [і інш.] ; пад. рэд. Я. К. Новіка. – 2-е выд. – Мінск : Нар. асвета, 2002. – С. 86.

*7.* Гісторыя Літвы / пер. з літ. Вінцэнт Вячорка. – Вільня : Santara, 2014. – 280 с.

*8. Голубеў, В. Ф.* Гісторыя Беларусі ад пачатку XIX ст. да 1945 г. / Валянцін Фёдаравіч Голубеў, Ірына Фёдараўна Кітурка. – Мінск : Выд. Зміцер Колас, 2015. – 254 с.

*9. Голубеў, В. Ф.* Гісторыя Беларусі – даты, падзеі, асобы: інфарм.-метад. дапам. / В. Ф. Голубеў. – Мінск : Лімарыус, 2013. – 176.

*10. Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.

*11.* История БССР : учеб. пособие для вузов / под ред. В. В. Чепко, А. И. Игнатенко. – Минск : Изд-во БГУ, 1981. – Ч. 1. – 328 с.

*12. Ігнатоўскі,У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі ; уступ. арт. А. П. Працкевіча; камент. і заўвагі Э. Н. Гнеўкі. – 3-е выд. – Мінск : Беларусь, 1991. – 190 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

14. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 63 с.

15. Нарыс гісторыі Польскай дзяржавы і Народа. X–XXI стст. – Варшава : Demart, 2005. – 312 с.

16. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Ч. I / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. – Мінск : Беларусь,1994. – 527 с.

17. *Паноў, С. В.* Матэрыялы па гісторыі Беларусі: 42 тэмы для вывучэння: заданні для самакантролю: ілюстрацыі: лагічная схема: тэрміналагічны слоўнік: храналагічная табліца: слоўнік персаналій: карты / С. В. Паноў ; пад навук. рэд. М. Е. Сташкевіча, Г. Я. Галенчанкі. – 11-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2009. – С. 158, 393, 394.

18. *Платонов, С. Ф.* Учебник русской истории / С. Ф. Платонов. – СПб. : Наука, 1994. – 429 с.

19. *Смолік, А. І.* Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі : ВМК / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 79–81.

20. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі ; пер. з рус. Т. М. Кутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мінск : БелЭн, 1994. – 510 с.

21. *Цяплова, В. А.* Гісторыя Беларусі XIX ст. : ВМК / В. А. Цяплова, А. Г. Каханоўскі, І. Я. Грыбко. – Мінск : БДУ, 2004. – С. 82, 121.

22. *Шымуковіч, С. Ф.* Гісторыя Беларусі: для школьнікаў і абітурыентаў / С. Ф. Шымуковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 166–167.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ